№ 132



ЛАСТАЎКА

№ 3.

[illegible] 1923 [illegible]



Складайце ахвяры

на першую беларускую
дзіцячую часопісь у Лат-
ві!
Падтрымлівайце „Ластаўку"!

Надрукавана у ліку 75 экзэмпляраў

ЛАСТАЎКА

ВУЧНЁЎСКАЯ ЧАСОПІСЬ

№6 Люцынскае Беларускае Гімназіі 1924 г.

Выдаецца з дазволу Міністэрства прасьветы і за адпаведнасьцю Кіраўніка Гімназіі гр-м. К. Б. ЕЗАВІТАВА.

Люцын. Сьнежань. 1923-24 в. год.



Сыну Беларусі.

Слаўны сын айчызны
Да працы ідзі,
Ворагу адважна
У вочы глядзі.
Пакажы ты сьвету
Усю моц сваю;
Дакажы, што любіш
Родную зямлю.
Што дзеньеш і церпіш
Усё жыцьцё сваё,
Што ўжо надоела
Чужынца ярмо.
Пад чужой уладай
Доўга ты гібеў;

Але не загінуў,
А моўчкі цярпеў.
Але і цярпенню
Ужо прыйшоў канец;
Насіць надаела
Цярновы вянец.
Дык хутчэй да працы
Беларусі сын!
Не прасі апекі —
Працуйся адзін.

Пятрусь Сакол.





Беларусь.

Беларусь мая,
Любімы край!
Зямля твая —
Дык быццам рай!

Цябе люблю,
Зямля мая!
Не уступлю
Нікому я!

Першы верш Сьцяпана Шабуневіча, вучня I-ае (V) клясы Беларускае гімназіі.



Зімовая сьцюжа.

Трашчыць мароз па завугольлям,
Трэ сівою барадой.
Па сьвету ночанька гуляе,
Абняўшыся з лютаю зімой.
Вось асьцярожна, з-па-за хмарак,
Узглянуў на зямлю маладзік.
Ціха навакола... Ветрык — дым, —
Спудзіўшысь сьцюжы, — недзе зьнік.
Ой, — гора! — Птушачкі малыя, —
Мароз у грудзёх дыханьне жме!..
Хто-ж абароне вас, родныя,
Пакуль вясна з цяплом прыйдзе.

В. Кахоўская.

Вучаніца II (VII) клясы.



Зіма.

Плача зіма-бараўніца.
Сьлёзы ях ст[illegible] цякуць
Ўздыхае сівой бабулі,
Вясеньня дні, што ўжо ідуць.

Зьмяркнула зноў, замаркоцілась
Пхікаў і мароз халоў.
А прырода і людзі ўсе рады:
Ўсе чакаюць ўжо Красну-Вясну.

Ц. Казлоўская.

Вучаніца 2 V-(VІ) клясы.



[illegible]

[illegible]

(п'еса.)

Акт II-гі.

(Сцэна прадстаўляе сабой бедную вясковую хату. Направа — [illegible], налева — [illegible]. Стаіць у адным вуглу некалькі лаваў і [illegible] [illegible]. Як [illegible] [illegible] [illegible] месяц [illegible].)

Кацярына [illegible] [illegible].)

А [illegible], шэра [illegible],
Пацеш мяне сіроцінухну,
Няма ж у мяне матухны,
А няма ў мяне татухны,
А сіроцінухна-ж я [illegible]!..

Старчыха, (ўходзе) Пахвалёны! (кажа [illegible] тры разы, прагаворваючы) [illegible], [illegible]!..

Кацярына (абціраючы вочы канцом хусткі) На векі, роднае. Сядай, ды [illegible] [illegible] [illegible] і ставіць на [illegible].)

Старчыха. (Сядзе на лаве). Чаго ж, маё [illegible] [illegible] такая фурна цяжка [illegible].

Кацярына. Яна ўжо шустака мне [illegible], [illegible] так-многа [illegible]. Гора сіротцы з [illegible] бядой [illegible]. Але, што рабіць, на ўсё [illegible].

Старчыха. (Бера [illegible] [illegible], [illegible] [illegible] ([illegible] ў грудзі).

[illegible]. ([illegible]). А мо' [illegible] чаго [illegible].

Старчыха. Дзякуй родная, - а я і запрацую [illegible] [illegible] - дома [illegible].

Кацярына. (Выходзе ў сені).

Старчыха. Здаецца, што [illegible] загадаць [illegible] старую [illegible]. Бо [illegible] ўжо яна [illegible].

Кацярына. (Уходзе, трымаючы міску й хлеб; ставіць яму на стол). Вось чым багата, тым і рада. ~~Кацярына. Вось чым~~ Ведаеш, [illegible] печы не [illegible]. Вось толькі што хлеб [illegible].

Старчыха. (Перад ежай хрысціцца тры разы ў бок [illegible] ў грудзі прыгаварываючы): Чур мяне, чур мяне!

Кацярына. (Здзіўлена глядзіць на яе, але нічога не разумеіць і думае, што так і трэба).

Старчыха (ядучы). А, ведаеш што, [illegible],

я шукала табе ў тваёй бядзе.

Кацярына. Ну, мая родная! Як ты можаш мне памагчы? - адна я засталася на свеце. І бацька і матка памёрлі; родных, знаёмых, нікога няма.

Старыха. Ну, ягадзінка - будзеш багата, будзеш грошай шмат мець, дык [illegible] ў жыцці знойдзеш.

Кацярына. Дзе ж тых грошай дастаць? Скуль яны звалiцца могуць?..

Старыха. Нізкуль сапраўды не звалюцца, але трэба дастаць іх. Вось у гэтай справе я ў памогу табе.

Кацярына. Хрыстос Божа! - ці не красці ты мяне павядзеш?

Старыха. (Пры гэткі божым зараз-жа хмурнее [illegible]) Не ня тое. Ведаю я, дзе ў лесе схаваны вельмі вялікі скарб. Грошай там поўна з тую дзяжу будзе.

Кацярына. Навошта мне дзяжа грошай? Каб хату прыгожую - другую і то добра было-б. Адразу карову купіла-б, коніка, хату новую паставіла-б.

Старыха. Ну, вось, калі хочаш зрабіцца першай у сяле гаспадыняй - надзявайся дый пойдзем. Ў вечары вернішся да хаты багатай будзеш грошай мець столькі, колькі і ў пана няма.

Кацярына (крыху думае). Не ведаю, родная, - неяк боязна.

Старчаха. Ты, сястрыца, чаго там баішся? Толькі не ўжывай, рэчы скарб Імя Божага (Старчыха зараз-жа адварочваецца ў бок і робіць свой знак). І ўсё добра будзе.

Кацярына. Не ведаю! (Уразумі [illegible] садзіцца каля вакна. Пасьля кажа). Я, ведаеш, сястрыца, ідзі ты трохі пахадзі па сялу, а я тым часам з гаспадаркай прыбяруся ды падумаю, як мне быць. А ты крыху пагадзя зайдзеш.

Старчаха. Добра, добра ягадзінка, падумай, пагадай, а я зайду пасьля (робіць свой знак і выходзіць).

Кацярына (моўчкі садзіцца каля стала. Праз дзьверы неяк бязшумна ўходзіць Анёл і затрымліваецца, спыняецца; праз колькі хвілін прытуляецца да Кацярыны рукі).

Анёл. Кацярына, Кацярына, не прадавай душы сваёй нячыстаму духу - будзь лепей беднай, бліжэй будзеш да Бога; Кацярына, адумайся!

Кацярына (сплясканушы рукі). Божа, Божа, што мне рабіць? (У гэты час з падпечка высоўвае галаву Чорт.

Чорт. Гэй, маладзіца, што раздумываеш? Кінь думкі, ды зьбірайся ў дарогу. Ці табе баяцца

лепш трасуцца ў холадзе, ад голаду сцяжэць,
век свой у горы біцца, — ці быць гаспадыняю
на ўсю вёску?

Кацярына. Што тут рабіць, не ведаю. Трэба пайсці, бо й так ўжо нацярпелася ў-да-концу біцца. А хто ведае, што будзе далей, як я старою зраблюся? Хто тады дагледзе мяне? Ці ж я тады буду патрэбна?

Анёл (плачучы). Кацярына, ўздумайся пра Бога!

Кацярына. Што я тады буду рабіць, сіротачка горкая, як прыйдзе за мною хвароба ліхая? Ці праўда тады адна, ляжучы на печы, нікому не патрэбная? Хто паможа мне ў няшчасьці? Ой не, — трэба ісьці: не хочу больш ужо буду грашыць, калі не брацьмуць гэта старча. Апамятуюся, дык й пакаюся я.

Чорт (дзіка сьмяецца і хлопае ў далоні; пасьля хаваецца).

Кацярына (сядзіць задуманая).

Анёл (са сьлязамі выходзіць з дзьвярэй).

Кацярына (спыняецца; праз некалькі хвілін ўходзяць, пакланіўшыся, перабраныя старцы).

Старшыня. Ну, як-жа, згадзілася, пойдзеш?

Кацярына. Я ўжо дарма, толькі сьвінку пакіну.


Старшыня. Толькі глядзі, [illegible] ся пра тое, што ў тваё [illegible]

нашае дзесь скарб, як не паслухаешся мяне.
Кацярына. Добра, – на ўсё згаджаюся. Дзякую табе, бабачка, хоць астатнія гадкі мо ў дабрэ пажыву.
Старчаха, (пры слове „бабачка" робіць свой знак; пасьля дзяржае Кацярыну за руку). Дык хутчэй, ягадзінка; бяры лапату ды й пойдзем. Толькі з умовай, каб палова скарбу – мне засталася.
Кацярына. Хопіць з мяне і паловы. Будзе на ўсё жыцьцё і з гакам.
Старчаха. Ну, дык хутчэй пойдзем! (Кацярына бярэ лапату і йдзе наперад).
Старчаха, (ў публіку). Вось пакваліласі на лёгкі пажыву. Пачакаеш, як закрычыш ты заліваючыся ў вадзе. Але-ж цар вадзяны будзе рады: лішне яму адну душу прынясу. Іначэй будзе яму адна нагаданнея, а нам русалка-сястра. (Робіць свой знак і выходзе).
(Заслона).

Канец II-га акту.

Працяг будзе ў №7-ым.





Як селянін дабыўся ў цара праўды.

(Народнае апавяданьне).

Жыў калісь бедны чалавек, які меў маленькі кавалачак зямлі, старэнькую хатку і сьвіньню з парасятамі.

Зямля селяніна межавалася з зямлёй багатага пана, дом якога стаяў недалёка ад мяжы селяніна.

Сьвіньня селяніна часта пераходзіла панскую мяжу і рыла бульбу.

Пан некалькі разоў пагражаў застрэліць сьвіньню.

Селянін абяцаў больш яе не выпушчаць, але хутар яго быў маленькі, сьвіньні рабіць было нечага дык яна ізноў бегла ў панскую бульбу.

Пан раззлаваўся і нарэшце застрэліў мужыкову сьвіньню.

Баба пачала галасіць па сьвіньні, але мужык сказаў ёй:

— „Ні, плач баба, — гэтага з нас дар, о пану! — Я напішу цару просьбу на яго! — Ён у мяне даведаецца, як у мужыкоў свінню страляць!..“

— „Дурань, ты стары“ — сказала баба. — „У цябе і паперы няма і пісаць ты не ўмееш.“

— „Э, баба — напішу па свойму, цар выму-ны — усё разбярэ!“

Паперы селянін не знайшоў, а атрамэнту ў яго таксама зроду не было. Ах быць

Але селянін прыдумаў — узяў бяросту, прынёс каланіцу і давай шмараваць каланіцай па бяросце.

Нічога не выходзіць! — расплываецца дзёгаць па бяросце.

Кінуў селянін бяросту.

Дастаў ён ад кума сахарнае папе-ру — (той к хрэзьбінам купіў цукер) — развёў у вадзе сажу і прабуе пісаць.

Гэта выйшла трохі лепей.

Але дзе-ж мужыку ведаць пісаць?! Дык ён зрабіў гэтак: намаляваў му-жу, на адным баку мужы намаляваў,

[illegible] на другім — [illegible]; [illegible] намаляваў сьвіньню, якая [illegible] дрэву; на [illegible] пан-скага [illegible] намаляваў пана са стрэльбай, які меціўся ў сьвіньню.

Вось прэсьба і гатова.

Адправіўся селянін у Піцер да Цара.

Зьявіўшыся туды, пачаў ён пытацца: дзе жыве Цар. Яму растлумачылі, што да Цара яго не пусьцяць жаўнеры, а каб убачыць Цара, трэба ісьці зраньня да гарова саду, дзе Цар гуляе. Убачыўшы Цара, трэба стаць на калені, пакласьць прэсьбу на галаву і чакаць.

Селянін гэтак і зрабіў.

Зраньня ён пайшоў да саду, стаў каля плоту і чакае Цара.

Хутка паказаўся Цар, але селянін яго не спазнаў, бо Цар быў адзеўшыся не так як яго бачыў селянін на партрэце, ён прыняў яго за жандара.

Цар убачыў селяніна і спытаў яго, чаго ён хоча.

Селянін адказаў, што прынёс цару

просьбу, але калі Цар хацеў узяць гэтую просьбу, дык селянін не даў яму, гаворачы: „Ты не Цар, табе не дам, а вось пусьці мяне да Цара."

Цар загадаў жаўнерам пусьціць да сябе мужыка ў палац. Селянін зьняўшы шапку, стаў на калені, паклаў просьбу на галаву й чакае.

Пачытаў Цар, узяў паперу, пагледзеў, павярцеў, — нічога не зразумеў, дык запытаўся ў селяніна: „Што гэта абазначае?"

Селянін разсмяяўся і сказаў: „Да ты ня ў во не разумееш. Вось — бачыш, — мяжа, а гэтая хата, тамака панаў дам і пан стрэляе ў маю сьвіньню і вось я шукаю за гэта суду." Цар сказаў селяніну: „Цара цяпер ка дома няма; ты аддай гэтую просьбу міністрам, хай яны разгледзяць яе, а калі яны не зразумеюць, дык разгледзіць сам Цар."

Сабраліся міністры. Селянін аддаў ім сваю просьбу. Тыя глядзелі, глядзелі й нічога не зразумелі: глядзяць ды плячымі ціскаюць.

Зло ўзяло селяніна, — пачаў ён міністраў ругаць: „Бухі вы, — дарма цараў хлеб толькі жарэце! Ніякае ад вас карысьці няма: мужыковым

тыкоў не зразумець!" Сапраўды міністры і слугі вераць гэта рабіць з мужыкамі. Але раптам адчыніліся дзверы й выйшаў цар. Усе ўсталі, выйшлі і скакалі і глядзіць пасіхоньку на цара.
Цар запытаўся ў чым тыкака справа,- яму адказалі, што мужыкі прынеслі нейкую не зразумелую паперу і яны рвалі іх. Тады цар папрабаваў гэтую паперу. Яму падалі. Цар паглядзеў і сказаў: "Што-ж тут нічога не зразумела? Дурані вы!



"Вось - мужык: "Та хата, вось панскі палац, лязна, а гэта там стрэлка ў мужыцкую сьвіньню." Мужыкі так і скочылі ўверх: "Вось дык цар! Вось жа зразумеў! Якраз так і было! А вы,- дурні міністры царовы,- сказаў ён на міністраў." Тады цар спытаў у яго, што ён хоча атрымаць за сьвіньню. Селянін думаў, думаў і ўрэшце сказаў: "Пан забіў сьвіньню і застаў нарэшце, дык трэба было-б іх ...
"Ну, а ты трыццаць сьвіньней дамоў на-

ніш!"- спытаў яго цар. „Згашю" - адказаў мужык.

Тады цар загадаў міністрам купіць мужыку трыццаць сьвіньней і той пагнаў іх да хаты.

Запісаў вучань IV (II)-ай клясы

Якуб Воркуль.



* *

*

Калі я іскруся душою да зораў,
І кроў калі ў жылах кіпіць, —
Магутная, смелая, вольная песьня,
Як гром, з маіх вуснаў грыміць!

*

Калі-ж у маім сэрцы пануюць сьлёзы,
Калі кляну долю сваю, —
Бяру я ў рукі забытую ліру
І сумную песьню пяю...

[illegible] Пятро Сокал —

Аб эспэранто.

Пад „эспэранто" разумеюць штучна прыдуманую ідэальную мову, прадназначаную дзеля таго, каб яна атрымала пашырэньне паміж усімі народамі сьвету і дала ім магчымасьць вучачы яе размаўляць друг з другам.

Патрэбнасьць такое мовы, якая-б была зразумелай для ўсіх народаў сьвету ясна сама сабой, а нам вучням, якім прыходзіцца ўжо сёньня вучыць цэлых пяць моваў (беларускую, латыскую, расейскую, нямецкую і лацінскую) — патрэбнасьць гэткае мовы ня толькі зразумела, але і неадкладна патрэбна.

Чаму-ж — паўстае пытаньне — выдумляць якуюсь яшчэ штучную новую мову, калі можна было-б узяць якую-кольвек з ужо існуючых моваў і ўмовіцца ўсім карыстацца ёй?

Але прыглядзеўшыся бліжэй, мы зараз жа

бачыма, што гэта ня толькі цяжка, але і нават зусім немагчыма.

Перш-на-перш — чыю мову браць?

Узяць францускую?

- Абразяцца немцы, ангельцы, кітайцы і ня будуць вучыць.

Узяць ангельскую?

- Абразяцца французы і іншыя.

Прабавалі ўзяць мову „мёртвую“ — лацінскую або грэцкую, але яны аказаліся цяжкімі для навучэньня.

Апрача гэтага ўзяць якую-небудзь новую мову ўжо таму цяжка, што ўсе яны, як і лаціна, маюць цяжкую граматыку і шмат розных правілаў, з нялічанымі выключэньнямі.

Трэба было або шукаць жывой, простай з няхітрай граматыкай мовы, або ствараць гэткую мову штучна.

Жывой мовы, адпавядаючай гэткім патрабаваньням не знайшлося, вось і прыйшлося ствараць новую мову, з найпрасьцейшай граматыкай і лёгкім словаабразаваньнем з невялікага ліку карэньняў.

Этак нарадзілася „Esperanto."

* *

*

Прастата яго граматыкі, дужа малы лік правілаў, а таксама лёгкасьць утварэньня словаў ад вядомых ужо кораняў — усё гэта хутка пачало вербаваць шматлічных паклоньнікаў эспэранто і ён пачаў заваёўваць сабе месца.

Перад пачаткам Міравой вайны на „эспэранто" выдавалася ўжо некалькі газэтаў і журналаў, было перакладзена шмат аўтараў і адбылося некалькі эспэранцкіх кангрэсаў, на якія зьяжджаліся прадстаўнікі эспэранцкага руху з усяго сьвету.

* *

*

Для нас, беларусаў, дужа важна пазнаёміцца з „Esperanto" бо гэта дасьць нам магчымасьць вайсьці ў зносіны з усімі эспэрантыстамі Міра і праз іх пазнаёміць усе народы з жыцьцём нашага многапакутнага народу.

* * *

Цікава адзначыць тое, што вучыць „эсперанта” нам будзе даволі лёгка, бо ўжо пачынаючы з самае азбукі, дужа падобнай да нашае беларускае лацінкі, дзе ёсьць і „č” і „š” і „ž”, знойдзем мы шмат для нас знаёмага.

Л.





НАРОДНЫЯ СЬПЕВЫ

у сялян-беларусаў Пасінскае воласьці, Люцынскага павету.

Запісаў вучань VII (IX) клясы, Антон Лапаценак, у вёсцы Цяражова.

5.

(Свад[illegible]ная, вірцовая).

[illegible] (імя) [illegible] этаў, –
[illegible] нагадзі р[illegible] татаньку.
[illegible] ідзь, вось стогніць сыра маць-зямля,
Вось грыміць, вось [illegible] зялезныя коні,
Вось іржуць [illegible] вараны коні.
Вось едзе[illegible], вось [illegible] родны татанька.
Вось [illegible]
У [illegible] – бел[illegible],
А [illegible]

6.

(Свадзебная).


А хто ў нас харошы,
І хто ў нас прыгожы,
Ай лёшыньки-люлі (2 разы).
(Імя) ў нас харошы,
(Імя) ў нас прыгожы,
Ай лёшыньки-люлі (2 разы).
Ён коніка выводзіць,
А конік так і [illegible]ць,
Ай лёшыньки-люлі (2 разы).
Коніка сядлаець,
Конік [illegible]аець,

Ай, лёшанькі-люлі (2 разы).
На коніка садзіцца;
Конік весяліцца,
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).
Ён полейкам едзіць,
Полейка бялеіць,
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).
К саду пыръжджаіць,
Сады расцьвітаюць,
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).
К крыльцу пад'яжджаіць,
Паненка выходзіць
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).
Хустачкай махаіць,
(Імя) вітаіць,
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).
„Даўно цябе чакала,
Пасьцель мягку слала",
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).
Крэпка абнімала,
Сладка цалавала,
Ай лёшанькі-люлі (2 разы).



Вальс „Ластаўка“

Мэлёдыя „Ластаўкі“



Янка Кудраўцаў,
вучань ІІІ-яе (IX) клясы Беларускае гімназіі.

Справа

па вечарыне-спэктаклю [illegible] Бе-[illegible] 1923-га году

Прыход:

	Руб.	Кап.
1. Ад продажы білетаў на вечарыне, па акту № 1 ...	7.320.	—
2. " латарэі-алегры, згодна акту № 2 ...	2325.	—
3. " продажы праграмаў, кветак, пісулек і сэрпантыну, згодна акту № 3 ...	964.	50.
4. Ахвяраў атрымана ад:		
гр. Ярашэвіча ...	100.	—
" Савіцкага ...	20.	—
" Чэлыц ...	30.	—
кс. Дэкана ...	100.	—
гр. Жданка ...	100.	—
" Гурэвіча ...	100.	—
Разам ...	11.059.	50.
Выдаткі ...	5.986.	—
Чыстае прыбыль.	5.073.	50.

Адказны Кіраўнік — К. Езавітаў.

Здача

Марускае вечарынкі, што адбылася 8-га у зале Крупа

Выдаткі:

		Руб.	К.
1.	За друк афішаў і за білетныя кніжкі па рахунку В. Сурра № 1 ...	575.	–
2.	" клей і др. рэчы для дэкарацыі па рахунку А. Гілевіча № 2	350.	–
3.	" аптэчкі, паперы і ін. рэчы для кіоску па рахунку Буніловіча № 3 ...	207.	–
4.	" картон для дэкарацыяў па рахунку Левіна № 4	458.	–
5.	" дэжурства нараду пажарных па рахунку № 5	200.	–
6.	" грыміроўку ўчасьнікаў спэктаклю па рахунку Баума № 6 ...	250.	–
7.	" залю і музыку па рахунку Крупа № 7	2.250	–
8.	" рэчы, парадзеныя на сцэну з буфэту па рахунку Крупа № 8	90.	–
9.	" рэчы, ўзятыя на латарэю-аллегры па рахунку Пленас № 9	1521.	–
10.	" гербав. маркі на атрыманне дазволу на вечарынку і латарэю і адрасоўку пісьмаў у Рн	85.	–

Разам ... 5986. –

Ахвяры на „Мастаўку.“

1. Па справаздачам, зьмешчаным у № 1, № 2, № 3, № 4 і № 5 атрымана ахвяраў .... 2560 р.

Ад Дырэктара Гімназіі гр. К.Б. Езавітава .... 200 ..

Разам .... 2.760 р.



Рэдактар: Рэдакцыйная Калегія.

Выдавец: Выдавецкая Сэкцыя Вучнёўскага Гуртка Люцынскае Беларускае Гімназіі.

Зьмест.

Малюнкі:

Кошт 25 руб.